ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА №1 г.ДЗЯТЛАВА”

# Экскурсія ў школьным музеі
# “Гісторыя Дзятлаўшчыны”

**Тэма: Архітэктурная спадчына Дзятлаўшчыны.**

**Катэгорыя навучэнцаў**: вучні 5-11 класы.

**Мэта:** пазнаёміць з архітэктурнымі збудаваннямі г.Дзятлава і раёна.

**Задачы:**

- расказаць аб архітэктурных помніках Дзятлаўшчыны ;
- выхоўваць і стымуляваць цікавасць і павагу да гістарычнага мінулага свайго народа.

**Працягласць экскурсіі**: 35-45 хвілін.

**Абсталяванне:** матэрыялы экспазіцыі “Помнікі архітэктуры Дзятлаўшчыны”, відэаэкскурсія “Падарожжа па вуліцах старога Дзятлава”, прэзентацыя “Архітэктурная спадчына Дзятлаўшчыны”)

Складальнікі: Буйко Ганна, Семенік Таццяна,
вучні 8 “Б” класа,
члены гуртка “Юныя экскурсаводы”
Кіраўнік: Макарэвіч Аліна Сяргееўна,
кіраўнік музея

**2016**

**Экскурсавод1** : Мы знаходзімся каля экспазіцыі, якая прысвечана архітэктурным збудаванням Дзятлаўшчаны.

Асноўным архітэктурным аб'ектам плошчы ў г. Дзятлава з'яўляецца касцёл Успення Найсвяцейшай Панны Марыі, пабудаваны ў 1646 Казімірам Львом Сапегам, пра што сведчыць надпіс на будынку на лацінскай мове: "На славу Усемагутнага Бога і ў гонар Узнясення Прачыстай гэты храм пабудаваў Казімір Леў Сапега, падканцлер ВКЛ, Слонімскі Дзяржаўцаў 1646 Н. Х."

Пры непасрэдным удзеле Казіміра Сапегі ў касцёле пачаўся збор багатай бібліятэкі. Праўда, кнігазбор згарэў у час пажараў у XVIII стагоддзі.

Пасля вялікага пажару 1743 г., які знішчыў мястэчка і касцёл (згарэў галоўны алтар, унутранае начынне, архіў, труны з нябожчыкамі ў крыпце), у 1751 г. галоўны фасад і інтэр'ер перабудаваны архітэктарам А. Асікевічам па фундацыі М.Ф. Радзівіла. Пасля пажару 1882 г. заменены дах. У 1900 г. касцёл быў абнесены высокай мураванай сцяной. Уздоўж правай сцяны агароджы цягнуліся гандлёвыя рады.

Гэта помнік архітэктуры барока паслужыў «дэкарацыяй» для фільма «Паланэз Агінскага».

Ён быў сведкам Паўночнай вайны, у час якой шведы спалілі самую старажытную пабудову мястэчка — драўляную крэпасць, узведзеную яшчэ князем Канстанцінам Астрожскім. Муры касцёла зведалі нашэсце Напалеона ў 1812 годзе, Першую і Другую сусветныя войны...

**Экскурсавод 2**: Яшчэ адной прыгожай пабудовай Дзятлава з’яўляецца царква Прэабражэння Гасподня. Першы храм быў пабудаваны ў 1508 г. заснавальнікам Дзятлава князем Канстанцінам Астрожскім. Падчас аднаго з пажараў царква згарэла, і на яго месцы ў пачатку XVIII стагоддзя была пабудавана новая, драўляная у выглядзе карабля. Праз 400 гадоў царква разбурылася. На яе месцы быў пабудаваны часовы будынак, які стаіць і цяпер. А на вялікую мураваную царкву пачалі рыхтаваць праектную дакументацыю. Чарцяжы задуманай царквы ёсць у фондах Дзятлаўскага музея. Але справу давесці да канца не ўдалося. Пачалася Першая сусветная вайна. Толькі ў 1938 годзе, пад кіраўніцтвам інжынера Мацієўскага, пачалі заліваць падмурак пад спраектаваную царкву. На гэты раз будаўніцтву перашкодзіла Другая сусветная вайна.

Цікавымі ўспамінамі пра гэта будаўніцтва падзяліўся з намі жыхар Дзятлава Белавус І.І., які працаваў у той час рабочым. Калі яны капалі катлаван пад падмурак, то раптам натыкнуліся на нешта цвёрдае. Прабілі. Далей пустата. Выклікалі з Навагрудка інжынера Мацієўскага з картамі. Той паглядзеў і сказаў, што гэта падземны ход, які вядзе з палаца да касцёла і далей. Сценка падземнага хода была зроблена з вапны, вельмі цвёрдая. Гавораць, што старажытныя майстры дабаўлялі ў раствор жаўткі яек, што надавала вапне такія якасці. Дарэчы, сярод жыхароў Дзятлава з пакалення ў пакаленне перадаюцца паданні пра падземныя хады паміж касцёлам, капліцай і палацам. Інжынер загадаў дзірку заліць бетонам. Для гэтага нават з Наваельні на конях прывезлі чыгуначныя рэйкі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў царкве праводзілася медыцынская аперацыя па выратаванні жыцця партызанскага камандзіра Біцько. У нейкай ступені парушаючы царкоўныя каноны і ўстаў, дзеля выратавання чалавечага жыцця тагачасны настаяцель храма айцец Іаан Комар благаславіў правесці аперацыю ў алтары храма. Па горадзе хадзілі нямецкія патрулі, а ў царкве аперыравалі партызанскага камандзіра. Гэта пагражала жыццю многіх прыхажан, у тым ліку і айцу Іаану. Толькі Божая ласка адвяла пагрозу.

Расказваючы аб Прэабражэнскім храме нельга не прыгадаць і аб цудах, якія адбываліся тут. Цудам можна лічыць тое, што ў савецкія часы, гады ганенняў на веру, храм не зачыняўся, не быў пераабсталяваны. У ім пастаянна ішла шчырая малітва. Нельга не ўзгадаць і яшчэ адзін цуд -- міраточанне Галгофы.

Адбылося гэта зімой, 19 снежня, у дзень памяці святога Мікалая Цудатворцы. Галгофа міраточыла на працягу двух тыдняў -- да Ражства. Аповед аб гэтым цудзе, які адбыўся ў нашым храме, увайшоў у кнігу "Цуды свяціцеля Мікалая".

Ёсць у храме Прэабражэння Гасподня і святыня -- ікона Амвросія Опцінскага з частачкай яго мошчаў. Амвросій Опцінскі -- адзін з найбольш вядомых старцаў Опцінскай пустыні, якую наведвалі Гогаль, Дастаеўскі, Леў Талстой.

**Экскурсавод 1:** Цікавым архітэктурным помнікам з’ўляецца палац Радзівілаў, пабудаваны ў сярэдзіне XVIII стагоддзя на беразе ракі Дзятлаўкі. Спачатку пабудова належала Радзівілам, а пазней перайшла ва ўласнасць маршалка Вялікага княства Літоўскага С.Солтана. За ўдзел апошніх у паўстанні 1830-1831 гадоў палац канфіскаваны ў дзяржаўную маёмасць. Быў прыстасаваны пад кавалерыйскую казарму. На пачатку XX стагоддзя ў палацы размяшчалася двухкласная настаўніцкая школа, у якой у 1912 годзе вучыўся наш знакаміты зямляк І.С.Дварчанін. У 30-я гады, калі раён знаходзіўся ў складзе Польшчы, тут размяшчаўся сірочы дом.

У пасляваенны перыяд палац быў пераабсталяваны пад медыцынскую ўстанову. Да сённяшніх дзён захаваўся палацавы корпус, часткова захаваліся гаспадарчыя пабудовы, парк і сажалкі. Сёння ён чакае рэстаўрацыі. Пройдзе час і гэты рэдкі помнік архітэктуры запросіць да сябе сваіх наведвальнікаў.

**Экскурсавод 2:** Помнікам архітэктуры класіцызму з’яўляецца капліца, пабудаваная з каменю, абломкаў чарапіцы і цэглы у 1813 г. Знаходзіцца на гарадскіх могілках

**Экскурсавод 1**: Цэнтрам любога беларускага мястэчка была плошча. Тут праводзіліся ярмаркі, гандлявалі. Галоўная плошча Дзятлава носіць назву «Плошча 17-га верасня» і цікавая сваёй забудовай, якая адносіцца да XIX - пачатку XX стагоддзя. У гады вайны наша яна называлася “Плошча Адольфа Гітлера”.

**Экскурсавод 2**: Архітэктурныя збудаванні ў нашым горадзе – гэта дыялог мінулага з сённяшнім жыццём. Сапраўднасць гэтых слоў можна ўявіць у час прагулак на вуліцах дзятлава, дзе сённяшняе жыццё пераплятаецца з мінулым. А без мінулага няма будучыні.

А зараз мы запрашаем вас прыняць удзел у экскурсіі па вуліцах старога Дзятлава. (прагляд відэаэкскурсіі) і завочным падарожжы па архітэктурных збудаваннях Дзятлаўскага райна.

(прагляд відэаэкскурсіі “Падарожжа па вуліцах старога Дзятлава”, прэзентацыі “Архітэктурная спадчына Дзятлаўшчыны”)